# Заданні да конкурсу “Знак таленту”
# 20.04.2023

**Тэма:** “Творчасць як духоўнае адраджэнне народа ў паэмах Якуба Коласа “Сымон-музыка”, Янкі Купалы “Курган”, Максіма Танка “Люцыян Таполя”

**Заданне 1**

**Паглядзіце на малюнкі і фотаздымкі. Адкажыце на пытанні да іх.**

**Частка 1. Запішыце прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, гады жыцця тых людзей, якія выяўлены на фотаздымках. Таксама запішыце іх псеўданімы.**

**А)**



**Б)**



**В)**



**Частка 2. Разгледзьце малюнкі і фотаздымкі і адкажыце на пытанні да іх**

А) На малюнках адлюстраваны шэраг падзей з жыцця аднаго з паэтаў. Пра каго ідзе гаворка, якія падзеі ці перыяды яго жыцця адлюстраваны? Калі яны адбываліся? Дастаткова запісаць толькі год ці гады.







Б) Хто з паэтаў паказаны на фотаздымку? У які перыяд яго жыцця і ў якіх абставінах мог быць зроблены гэты фотаздымак? Дайце як мага больш разгорнуты адказ.



В) Разгледзьце музейны экспанат на фотаздымку і запішыце да якога эпізоду біяграфіі якога творцы ён адносіцца?




**Частка 3. Вокладкі якіх кніг пададзены ніжэй? У якім годзе яны былі ўпершыню выдадзены і за чыім аўтарствам?**

А)



Б)




В)



**Частка 4. У якіх населеных пунктах знаходзяцца наступныя помнікі?**

**А)**



**Б)**



**В)**



**Заданне 2.**

**Пазнайце героя паэмы па апісанні, запішыце яго імя.**

| | |
|---|---|
| **1.** …парк вартуе,<br>Службу верна ён нясе,<br>Ўсё агледзіць і прачуе,<br>Ўсе кутыператрасе.<br>Тая ж вопратка мужыча –<br>Світка рудая і брыль. | **6.** Невыдумная світка — убор на плячах,<br>Барада, як снег белы — такая,<br>Незвычайны агонь у задумных вачах… |
| **2.** ... слаўны свету ўсяму,<br>Недаступны і грозны, як хорам;<br>Хто хацеў, не хацеў — біў паклоны яму,<br>Спуску, ласкі не знаў непакорам. | **7.** Гэты дзед – пастух гуртовы,<br>Слаўны дзед, дзядок – душа,<br>Гаваркі, мастак на словы,<br>І любіў ён малыша! |
| **3.** … як з ім не паладзіць?<br>Як бы ты ні быў з ім груб –<br>І пасудзіць і парадзіць<br>Ды і выпіць даць не скуп,<br>Абы толькі былі грошы,<br>Няма грошай – напавер, –<br>Адным словам, быў харошы,<br>Толькі й ты яму адмер. | **8.** Быццам гром ударыў у ... .<br>Слугі вывелі яго пад рукі,<br>Ледзь жывога у палац завезлі.<br>Дзесяць дзён хварэў …<br>І крычаў, каб прывялі … .<br>На дзесяты дзень памёр світаннем. |
| **4.** … красачка дзяўчынка:<br>Рост у меру, тонкі стан,–<br>Пазайздросціць ёй былінка,<br>Што аздобіла курган.<br>Вочы … – дзве зоркі,<br>Броўкі – выгібы крыла… | **9.** Ой, відаць, нягодны, гад!<br>Ды куслівы ж ён, псялыга!<br>Ён музыкам быў у замку,<br>Капельмайстра меў пасад. |
| **5.** Пад яго рукамі,<br>Бы ад нейкіх чараў,<br>Ажывала нават нежывое,<br>Немагчымае рабілася магчымым:<br>Гнуўся камень,<br>А з звычайнай цэглы,<br>Быццам з бронзы,<br>Паўставалі здані… | **10.** … перад ім<br>Сівы дзед стаіць, сагнуўся,<br>Вокам міргае сляпым.<br>Страшны, бледны, абарваны,<br>Жыцця пасынак… |

**Заданне 3**

**Адкажыце на пытанні.**

**1.** Якімі прафесіямі валодаў Люцыян Таполя ў аднайменнай паэме Максіма Танка?

**2.** Хто стаў прататыпам біскупа Сямашкі ў паэме “Люцыян Таполя” і чым ён запомніўся ў гісторыі?

**3.** Што такое батлейка? Якія аналагі батлейкі вы ведаеце?

**4.** Што сімвалізуюць вобразы Ганны, Дамініка і Сымона ў паэме Якуба Коласа “Сымон-музыка”?

**5.** Якія знакі і сімвалы прарочаць разбурэнне і разлад у княжым замку ў паэме “Сымон-музыка”?

**6.** Праслухайце ўрывак з паэмы “Сымон-музыка”.

*Эх, чаго нам ні прыйшлося,*
*Брацце мілыя, ужыць!*
*Колькі талентаў звялося,*
*Колькі іх і дзе ляжыць*
*Невядомых, непрызнаных,*
*Не аплаканых нікім,*
*Толькі ў полі адспяваных*
*Ветру посвістам пустым!*

Паспрабуйце ўзгадаць гістарычныя падзеі і перыяды, калі беларуская зямля страціла вялікую колькасць сваіх таленавітых сыноў і дачок.

**7.** Якім вершаваным памерам напісана паэма Янкі Купалы “Курган”?

**8.** Што сімвалізуе курган у аднайменнай паэме Янкі Купалы?

**9.** Якія стылістычныя, жанравыя, ідэйныя асаблівасці аб’ядноўваюць тры заяўленыя ў тэме конкурсу паэмы?

**10.** Узгадайце творы беларускай і сусветнай літаратуры (акрамя тых, што рыхтавалі да сённяшняга конкурсу), у аснове якіх выявіўся б канфлікт мастака і ўлады.

**Заданне 4**

**Дапоўніце цытаты і вызначце паэмы, з якіх яны ўзяты.**

| № | Цытата | Словы | Назва твора |
|---|---|---|---|
| 1. | На ____ там птушка садзіцца, пяе,<br>У____ воўк нема вые;<br>Сонца днём распускае там косы свае,<br>Ночкай зоры глядзяць залатыя. | | |
| 2. | І паўзуць угору<br>Па душу, па думку чалавека,<br>Што, як сонца, слепіць вочы ім.<br>Толькі не спыніць палёту _____,<br>І век ______не пагасіць ім —<br>Чорным сілам пекла. | | |
| 3. | Гэты быў хлапчук _____.<br>У яго _____ жывых<br>Думка нейкая бліскала,<br>Утаропіцца, глядзіць,<br>І на губках _____, бывала,<br>Заблукае, задрыжыць; | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4. | І лілася _____нявінна,<br>Швед набытак наш паліў,<br>А _____царскі самачынна<br>Тут гвалтоўнасці тварыў,<br>Будаваў астрог народу<br>І барбарскім капылом<br>Мерыў волю і свабоду,<br>А культуру нёс з калом. | | |
| 5. | І, пад страхам пекла і пракляцця,<br>Цэлых _____ год адбыць пакуты<br>І не брацца за сваё ______. | | |
| 6. | Бачыш, княжа, загоны, лясы, сенажаць,—<br>Ім пакорны я толькі з гуслямі,<br>Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць,—<br>Не скуеш толькі ____ ______ | | |
| 7. | Ён стаіў у сэрцы думу,<br>Каб дагадак не было.<br>Як жа вызваліць з палону<br>_____, сэрца яго часць? | | |
| 8. | А як стане не ў трыванне,<br>І тады чакаць пакорна,<br>Пакі стане жыць прасторна?<br>А змаганне? Дзе ж змаганне?<br>Ой, не, дзедку: процiў сілы<br>Можна ставіць толькі ____,<br>Калі хочаш ты ўстаць з пылу,<br>Калі цягнуць з цябе жылы. | | |
| 9. | Гэта быў адзін з майстроў вялікіх,<br>Звалі яго ______ ______,<br>А па клічцы проста ______. | | |
| 10. | Я па-князеўску ўсім і плачу, і люблю!<br>Ты не хочаш дукатаў — не трэба!..<br>Ўзяці старца і ____ жыўцом у зямлю!<br>– Знае хай, хто тут пан: я — ці ____! | | |